# “Мой родны край”

(30.10.2025)

У рамках тэматычнага тыдня “Беларусь – наша Радзіма” ў старэйшай групе “Вясёлка” прайшоў інтэграваны занятак “Мой родны край” па адукацыйных галінах “Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін. Дзіця і прырода”.

Выхаванцы с задавальннем прыйшлі на дапамогу кітайскаму хлопчыку Сяоміну, які звярнуўся па відэасувязі с прапановай рассказаць пра краіну Беларусь.



Хлопчыкі і дзяўчынкі выконвалі заданні, якія былі схованы ў цудоўнай скрыні. Спачатку яны склалі карту Рэспублікі Беларусь.





Потым пагулялі ў дыдактычныя гульні “З якога дрэва лісток?”, “Чацвёрты лішні”, “Знайдзі і назаві пералётных і зімуючых птушак”.










З дапамогай гэтых гульняў выхаванцы пазнаёмілі Сяоміна з птушкамі, раслінным і жывёльным светам Беларусі.

Таксама дзеці ўспомнілі прыродныя сімвалы Рэспублікі Беларусь, пагуляўшы у гульню “Складзі кветку”, і паведамілі пра родны край, выразна прачытаўшы верш А. Вольскага “Беларусь” з дапамогай картак-сімвалаў.





Хлопчыкі і дзяўчынкі засталіся задаволены гульнямі і тым, што пазнаёмілі кітайскага хлопчыка з роднай краінай, а той у сваю чаргу паабяцаў расказаць ім пра сваю радзіму!